– отношения, соединяющие обучение и труд внутри учебных учреждений (производственное обучение в начальном и основном периодах);

– отношения по поводу производственного обучения, практики, производственной практики с учащимися профессионально-технического учреждения, средних специальных учебных заведений, студентами вузов;

– отношения между предприятием и работником, обучающимся в средней общеобразовательной школе, профессионально-технических, высших и средних специальных учебных заведениях, аспирантуре, вечерней (сменной) и заочной формах обучения, на подготовительных отделениях при вузах, и отношения повышения квалификации на производстве.

В соответствии с разработанной еще в советские времена и действующей до настоящего времени концепцией в предмет трудового права включаются собственно трудовые, т.е. отношения по применению труда в общественном производстве, и производные, тесно связанные с ними.

Существует точка зрения, согласно которой, в сферу регулирования трудового права входят только те отношения, где обучение проходит непосредственно на производстве. На наш взгляд, такая точка зрения не совсем обоснованна.

В отрасли трудового права (как и в любой другой) можно выделить отношения, в регламентации которых она является ведущей. Такие отношения являются основными, независимо от того, какими правовыми институтами отрасли они регулируются. При анализе отношений профессионального обучения как непосредственно на производстве, так и в сторонних организациях (учреждениях), можно сделать вывод о том, что оба вида вышеуказанных учебно-трудовых отношений входят в сферу регулирования трудового права как общественные отношения, связанные с трудовыми.

Необходимо также отметить, что на отношения, являющиеся смежными с другими отраслями права и связанные с непрерывным профессиональным обучением, распространяется режим правового регулирования ведущей отрасли.

***І.У. Вішнеўская***
БДЭУ (Мінск)

## ГРАМАДЗЯНСКА-ПРАВАВАЯ АДКАЗНАСЦЬ ПА СТАТУТУ ВКЛ 1588 г.

Грамадзянска-прававая адказнасць — гэта адказнасць фізічных і юрыдычных асоб, якая з'яўляецца наступствам невыканання або неналежнага выканання суб'ектыўнага грамадзянска-прававова абявязку,

у выпадку прычынення шкоды маёмасці або здароўю якой-небудь асобы, або маральнай шкоды.

Закон феадальнай Беларусі ўсталяваў агульны прынцып, згодна з якім страта маёмасці, учыненне шкоды якой-небудзь асобе накладвалі абавязак матэрыяльнай канпенсацыяй для аднаго боку і права патрабавання такой канпенсацыі для другога боку. Вінаваты быў абавязаны заплаціць за шкоду і страты, якія былі нанесены яго дзеяннем або нядбайнасцю. Такім чынам, падставаю адказнасці лічылася вінаватасць той асобы, што ўчыніла гэтую шкоду.

Хаця, як і ў крымінальным праве, існаваў прынцып індывідуалізацыі адказнасці, у некаторых выпадках заканадаўца адступаў ад яго. Так, за непаўналетніх і псіхічна хворых людзей адказвалі бацькі або апекуны. Паны адказвалі за шкоду, учыненую іх слугамі, прыгоннымі сялянамі. Аб'ём адказнасці быў звязаны не з віною, а з велічынёю страт, панесеных пацярпеўшым. Даказванне факта і памеру страты з'яўлялася абавязкам пацярпеўшага. Ён павінен быў пасля падачы скаргі (іскавой заявы) сабраць і прадставіць суду дасканалыя доказы факта правапарушэння, наяўнасці шкоды і страт, прычыннай сувязі паміж дзеяннем і нанесенай стратаю.

Нормы Статута 1588 г. абараняюць уласніка не толькі, як раней, шляхам замацавання санкцый за маёмасныя злачынствы (крадзеж), крыніцай якіх у большасці выпадкаў былі старажытныя прававыя звычаі, а і рэгламентацыяй пакрыцця страт за пашкоджанне чужой маёмасці. Грамадзянска-прававая адказнасць за шкоду, нанесеную чужой феадальнай маёмасці, усталёўвалася толькі ў выпадку доказу віны па неасцярожнасці. Наўмыснае пашкоджанне чужой маёмасці вяло да крымінальнай адказнасці. Напрыклад, раздзел X арт. 17, гаворачы аб неасцярожным учыненні пажару, вызваляе ад адказнасці чалавека. Але пры гэтым патрабуе прынясення прысягі аб тым, што пажар з'явіўся ў выпадку неасцярожнасці, а не наўмыснага дзеяння.

Абараняючы правы ўласніка, Статут 1588 г. рэгламентуе ўзнікненне абавязкаў на падставе прычынення шкоды, вызначае залежнасць адказнасці ад аб'екта, якому непасрэдна прычыняецца шкода. Статут усталёўвае, напрыклад, кошт буйной і дробнай хатняй жывёлы, птушак, паляўнічых сабак, лясных звяроў (раздзел XIII), рэгламентуе расцэнкі зямельных участкаў (раздзел IV, арт. 98), вызначае кошт дрэва адпаведна пародзе гаспадарчаму прызначэнню і інш. Гэта дапамагала суддзям у вызначэнні памеру спагнанняў за нанесеныя страты пры разглядзе пэўных судовых спраў.

Такім чынам, у заканадаўстве феадальнай Беларусі не было выразнага размежавання грамадзянска-прававой і крымінальна-прававой адказнасці, хаця пэўныя прыкметы тэндэнцыі да выдзялення грамадзянска-прававой адказнасці, якая ўзнікала на падставе правапарушэння, ужо назіраюцца.